Источник: **«Народная газета»** - **2012-07-07**

Чытаем Купалу разам

Сёння, у дзень 130-годдзя славутага песняра Беларусі па ўсёй краіне будуць чытаць вершы. У прыватнасці, у той жа Вязынцы, на малой радзіме паэта, адбудзецца грамадска-культурная акцыя “Чытаем Купалу разам”. “Народная газета” прапануе вам, паважаныя чытачы, таксама пачытаць вершы першага народнага паэта Беларусі разам з вядомымі людзьмі краіны.

Ірына ДАРАФЕЕВА, заслужаная артыстка Беларусі:
— Калі спяваю песню на гэты верш Купалы, то перад вачыма паўстаюць краявіды нашай Сінявокай краіны: малахітавыя лясы, дагледжаныя палі, празрыстыя рэкі і азёры. Бачыць такую прыгажосць і захапляцца ёю мяне вучылі мае бацькі. Любоў да Радзімы трэба выхоўваць з маленства.

Спадчына
Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай.
Аб ёй мне баюць казкі-сны
Вясеннія праталіны,
І лесу шэлест верасны,
І ў полі дуб апалены.
Аб ёй мне будзіць успамін
На ліпе бусел клёкатам
І той стары амшалы тын,
Што лёг ля вёсак покатам;
І тое нуднае ягнят
Бляянне-зоў на пасьбішчы,
І крык вароніных грамад
На могілкавым кладбішчы.
І ў белы дзень і ў чорну ноч
Я ўсцяж раблю агледзіны,
Ці гэты скарб не збрыў дзе проч,
Ці трутнем ён не з’едзены.
Нашу яго ў жывой душы,
Як вечны светач-полымя,
Што сярод цемры і глушы
Мне свеціць між вандоламі.
Жыве з ім дум маіх сям’я
І сніць з ім сны нязводныя...
Завецца ж спадчына мая
Ўсяго Старонкай Роднаю.

Анатолій РУБІНАЎ, Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:
— Я, как и люди старшего поколения, со школьной скамьи впитал в себя творчество народных поэтов Беларуси Янки Купалы и Якуба Коласа. Это классики белорусской литературы, это наше народное богатство и достояние. Но новый взгляд на Янку Купалу — человека и поэта — у меня появился после посещения купаловского музея "Ляўкі". Эти размышления привели к рождению следующих строк:

С неба звездочка упала,
Свет надежды нам неся.
На Купала, на Купала
Звездный мальчик родился.
Там кукушка в роще дальней
Куковала не спеша,
И жалейкою печальной
Отзывалася душа.
С детских лет недетский разум
Яркой звездочкой светил,
Этот мальчик ясноглазый
К нам недаром послан был.
Повели его дороги
Свежим утром по росе...
Бог талант дает немногим,
Но страданья дарит всем.
И душа его страдала,
Не найдя покой нигде...
В этом мире очень мало,
Кто любил бы так людей.
Был обласкан жизнью новой,
Но таил печаль в глазах,
И тревожил душу словом,
Словом, чистым, как слеза...

А если говорить о стихотворении "Маладая Беларусь", написанном сто лет назад, оно звучит как гимн нашему молодому независимому государству. Мечты белорусского песняра о независимой, процветающей Беларуси сегодня превращаются в реальность.

Маладая Беларусь
Вольны вецер напеў вольных песень табе,
Бор зялёны ўзняў дружным гоманам.
Сонца полымем вызвала к слаўнай сяўбе,
Зоры веру ўлілі сілам зломаным.
І ў час буры, нягод і вялікіх надзей
Зацвіла, расцвіла даўгажданая,
І крыніцай жывой над Айчынай сваёй
Паплыла, пацякла неспыняная.
Паплыла, пацякла з светлай казкай жыцця
Полем, лесам, гарой і далінаю...
З свойскіх кветак-пралесак — карона твая,
Ўся сама — ясната лебядзіная.
Зіхаціш і гуслярскаю песняй звініш,
Узнімаеш мінуўшчыну даўную;

Час сягонняшні ўперад ісці не пыніш
І глядзіш смела ў будучнасць тайную.
Смела ў сонцы ідзеш, як жывы агняцвет,
Сееш ласкава сны залацістыя;
Не пужае сумежны дакучны сусед,
Не пужае пуціна цярністая.
Ад мяжы да мяжы, ад капца да капца
Абнаўлення павевы расходзяцца,
Абнімае душу без граніц, без канца
Маці-радасць, што лепшы дзень родзіцца.
Ўжо не так тапары ў зялёным бары
Хвойкі валяць зімой маразянаю,
Ўжо не так касары ад зары да зары
Летам звоняць касой адкляпанаю.
Значан гарт у руках, чутна песня без слёз,
Грудзі славы надзеяй калышуцца,
Ў кнігі новы закон ёмка пёрамі з кос
Наўсяды людзьмі новымі пішуцца.
Расцвітай жа, ўзнімай на арліных крылах
Душы, сэрцы і думы заспаныя,
Вызывай, выклікай на вялікі прасцяг
Сілу, ведзьмай-пятлёй не чапаную.
Высылай, рассылай на край свет пасланцоў,
Як з гнязда сакалінага сокалаў,
Хай лятуць, далятуць да байцоў-удальцоў,
Хай грымяць весткай добраю ўвокала.
Годзе ў полі, у лясах ты, старонка, і так
Сіратой начавала забытаю,
Годзе выпіў крыві з сэрца крыўды чарвяк,
Косці вецер тачыў непакрытыя.
Падымайся з нізін, сакаліна сям'я,
Над крыжамі бацькоў, над нягодамі,
Занімай, Беларусь маладая мая,
Свой пачэсны пасад між народамі!..

Анатоль ЯРМОЛЕНКА, народны артыст Беларусі, мастацкі кіраўнік ансамбля “Сябры”:
— Верш “Жняя” для мяне як сімвал жаночай прыгажосці, чысціні, глыбіні душы і яе памкненняў. Яна “карануе песняй залатое жніва”, а значыць, менавіта ёй належыць роля “царыцы”, прадаўжальніцы роду людскога...

Жняя
Як сама царыца
У залатой кароне,
Йдзе яна ў вяночку
Паміж спелых гоняў.
З каласкоў вяночак —
Моладасці сведка —
На ёй зіхаціцца,
Як у садзе кветка.

На грудзях шчаслівых
Каптанок ружовы,
У руцэ сярпочак
Зублены, сталёвы.
Вецер абнімае
Стан яе дзявочы,
Сонца ёй цалуе
Шыю, твар і вочы.
Каласкі хінуцца
Перад ёй паклонна,
Дзівіцца ігруша
На мяжы зялёнай.
А яна — царыца —
Весела, шчасліва
Карануе песняй
Залатое жніва.
Смела йдзе ў сонцы
Ўся сама — як сонца,
Гэта жнейка наша
Ў нашаей старонцы.

Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ, дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі:
— Сёння высокаразвітая беларуская мова можа паспяхова абслугоўваць усе патрэбы жыцця сучаснага грамадства і функцыянаваць ва ўсіх сферах. Пра гэта пісаў і даваў наказ будучым пакаленням Янка Купала. Радкі яго верша “Роднае слова” застаюцца актуальнымі і цяпер.

Роднае слова
Магутнае слова, ты, роднае слова!
Са мной ты на яве і ў сне;
Душу мне затрэсла пагудкаю новай,
Ты песень наўчыла мяне.
Бяссмертнае слова, ты, роднае слова!
Ты крыўды, няпраўды змагло;
Хоць гналі цябе, накладалі аковы,
Дый дарма: жывеш як жыло!
Свабоднае слова, ты, роднае слова!
Зайграй ты смялей, весялей!
Хоць гадзіны сыкаюць, кружацца совы,
Жывеш ты на хвалу людзей.
Загнанае слова, ты, роднае слова!
Грымі ж над радзімай зямлёй:
Што родная мова, хоць бедная мова,
Мілей найбагатшай чужой!

Георгій КАЛДУН, папулярны спявак, тэлевядучы:
— Исполнение песни на слова Янки Купалы, которая принесла мне первую премию в конкурсе молодых исполнителей на “Славянском базаре в Витебске”, требует больших эмоциональных затрат. Она на самом деле звучит как молитва. В ней заложен высокий смысл, до которого вряд ли можно “подобраться” в молодом возрасте. Чтобы понять

его до конца, нужно что-то в жизни пережить. Теперь эту песню я исполнил бы по-другому.

Мая малІтва

Я буду маліцца і сэрцам і думамі,
Распетаю буду маліцца душой,
Каб чорныя долі з мяцеліцаў шумамі
Ўжо больш не шалелі над роднай зямлёй.
Я буду маліцца да яснага сонейка,
Няшчасных зімой саграваць сірацін,
Прыветна па збожных гуляючы гонейках,
Часцей заглядаці да цёмных хацін.
Я буду маліцца да хмараў з грымотамі,
Што дзіка над намі гуляюць не раз,
Каб жаль над гаротнымі мелі беднотамі,
Градоў, перуноў не ссылалі падчас.
Я буду маліцца да зорак і жаліцца,
Што гасяць сябе надта часта яны,
Бо чуў, як якая з неба з іх зваліцца,
З жыцця хтось сыходзе на вечныя сны.
Я буду маліцца да нівы ўсёй сілаю,
Каб лепшаю ўродай плаціла за труд,
Збагаціла сельскую хату пахілую,
Надзеі збытымі убачыў наш люд.
Я буду маліцца і сэрцам і думамі,
Распетаю буду маліцца душой,
Каб чорныя долі з мяцеліцаў шумамі
Не вылі над роднай зямлёй, нада мной.

Марына КУЗЬМІЧ